# Эканамічная гісторыя Барысаўскага рэгёна і горада Барысава

## *(з найстаражытных часоў да сучаснасці)*

*(Працяг, пачатак у №10-12 (175-177) за 2013 г., 1-12(178-189) за 2014 г. і 1-12(191-201) за 2015 г., 1-9(202-211) за 2016 г., 1-2(214-215), 4-12(217-225) за 2017 г., 1-11(226-236) за 2018 г., 1-2(238-239), 4-8(241-245), 10-12(247-249) за 2019 г., 1-2(250-251), 4-12(253-261) за 2020 г., 1(262) за 2021 г.)*

Найбуйнейшым прадпрыемствам барысаўскай індустрыі да зыходу нэпа і, адначасова, па вытворчасці запалак у БССР з'яўлялася фабрыка "Чырвоная Бярэзіна"(у структуру ўваходзіў ліцейны завод "Пралетарскі молат"). Знаходзячыся ў складзе запалкавага трэста, фабрыка, тым не менш, лічылася асобнай гаспадарчай (вытворчай) адзінкай. Акрамя таго,у адпаведнасці з пастановай ЭКОСО БССР "Аб размеркаванні прамысловых прадпрыемстваў на прадпрыемствы рэспубліканскага і мясцовага значэння" ад 4 студзеня 1926 г.барысаўская "запалка" была абвешчана прамысловым прадпрыемствам рэспубліканскага значэння.

Акрамя запалак, на прадпрыемстве выпускаліся фанерныя сядзенні, а таксама вымяральныя прыборы, тыпу вадзянога ўзроўню для праверкі гарызантальнасці плоскасці, які шырока ўжываўся ў будаўніцтве.Уся прадукцыя была запатрабавана і пастаўлялася далёка за межы рэспублікі.

Пры пастаянным росце спажывання запалак фабрыцы з года ў год спускаліся павышаныя вытворчыя планы. Так, на 1923-1924 гаспадарчы год прадугледжвалася выпрацоўка 88 тыс. скрынь запалак (1 тыс. каробкаў у скрыні). Да сярэдзіны 1924 г. было выканана 96,4 % нормы. У жніўні таго ж года калектыў фабрыкі абавязаўся выпускаць штодня 400 тыс. каробак запалак. У выніку, дзённая выпрацоўка паднялася з 320 да 370 тыс., а да снежня 1924 г. дасягнула 415 тыс. каробак.

Па меры павелічэння выпрацоўкі прадукцыі расла колькасць працоўнага калектыву. Калі ў красавіку 1921 г. на прадпрыемстве працавала 378 працоўных і службоўцаў, то да канца 1924 г. – 464, а да кастрычніка 1925 г. – 769 чалавек. Да сярэдзіны 1926 г. на прадпрыемстве працавала ў дзве змены ўжо 856 чалавек, да кастрычніка таго ж года- 1 тыс. 051 працоўны і службоўца.

Па дадзеных на 1 кастрычніка 1926 г. "Чырвоная Бярэзіна" выпусціла тавараў на суму 2 млн. 984 тыс. 791 руб., з якіх 282 тыс. руб. склаў чысты прыбытак.

Рост аб'ёмаў вытворчасці быў бы немагчымы без прэферэнцый і пераваг, якія атрымлівала фабрыка рэспубліканскага значэння.-Тым часам выконваць заданні з кожным годам атрымлівалася ўсё цяжэй.З фактараў, якія стрымлівалі нарошчванне аб'ёмаў вытворчасці, асноўнымі назавем абмежаваную прастору старых вытворчых карпусоў, састарэлае абсталяванне і яго нерацыянальнае размяшчэнне (прадпрыемства двойчы моцна пацярпела ад пажараў, пасля чаго цэхі прыходзілася аднаўляць зноўку), малое механізаванне вытворчых працэсаў.Да таго ж, калі ў стругальным і каробкаклейным цэхах вытворчы працэс быў адносна механізаваны (у 1925 г.для падачы каробак устанавілі механічны транспарцёр), то ў іншых цэхах пераважная большасць прац выконвалася ўручную.Перавага ручной працы пры мінімуме транспарціровачных сродкаў кампенсавалася ростам колькасці працоўных.-Культурна-адукацыйны і тэхнічны ўзровень у многіх з іх пакідаў жадаць лепшага, а абыякавае стаўленне да працы і сваіх абавязкаў вяло да частых парушэнняў працоўнай дысцыпліны.Да прыкладу, у першай палове 1926 г.нявыхады на працу па неўважлівых прычынах склалі 14% ад агульнай колькасці тых, хто адсутнічаў на сваіх працоўных месцах.

Акрамя іншага, прадпрыемства мела праблемы з электраэнергіяй, нягледзячы на ўстаноўку ў 1925 г. новых лакамабіляў (парасілавыя ўстаноўкі, дзе адбывалася ператварэнне цеплавой энергіі пары ў механічную энергію). Патрэбна было мяняць паравую машыну магутнасцю 200 конскіх сіл, усталяваную ў 1910 г. Пастаянна раманталіся воданагравальныя катлы.На мяжы магчымасцяў працавала гарадская электрастанцыя, якая знаходзілася на тэрыторыі фабрыкі.

У беларускім урадзе ведалі пра праблемы барысаўскай "запалкі". Яшчэ ў 1924 г. дырэктар фабрыкі Ш.Н.Зайдэнберг, зважаючы на праблемы прадпрыемства, падняў пытанне аб будаўніцтве новай фабрыкі (у 1925 г. талковага ўпраўленца перавялі на павышэнне ў Менск, прызначыўшы главой Беларускага гарбарнага трэста).

У лютым 1926 г. ЦК КП(б)Б зацвердзіў план развіцця прамысловасці на 1925/26 гаспадарчы год.З абвяшчэннем у СССР курса на індустрыялізацыю (1926) пытанне аб будаўніцтве ў беларускім Барысаве перадавой запалкавай фабрыкі было вырашана станоўча. Аднак у рэспубліцы не хапала ўласных сродкаў, рэсурсаў і тэхнічных кадраў для рэалізацыі вызначаных праектаў па рэканструкцыі старых і будаўніцтву новых прадпрыемстваў. У прыватнасці, праект барысаўскай "запалкі" распрацоўваўся ў г. Ленінградзе (Санкт-Пецярбург).

Прыступіць да прац планавалася ў 1927 г. з адкрыццём будаўнічага сезону ў красавіку.На працягу двух гадоў патрабавалася ўзвесці цэхавыя карпусы, абсталяваць, перавучыць працоўных і службоўцаў... Неабходна адзначыць, што рашэнне аб фабрыцы прынялі і прыступілі да яе будаўніцтва да афіцыйнай аб'явы 1-й савецкай пяцігодкі (1928/29 – 1932/33).

*(Працяг будзе)*

**_Аляксандр Балябін,_**
*гісторык-археограф ДУК "Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І.Х.Каладзеева"*